Источник: "Звязда" - 2014-12-23



# СПРАВА РУК ЧАЛАВЕЧЫХ

## Культуру ствараюць людзі, а яна потым стварае іх

**Гукі свістулек напаўнялі прастору, галасы беларускіх дуд ажывалі ў свядомасці, калі бачыла стэнд з музычнымі інструментамі. Карціну дапаўнялі людзі ў гістарычных строях. А яшчэ вы б пачулі, якім чынам новыя тэхналогіі (напрыклад, 3D-мадэлі помнікаў архітэктуры) могуць дапамагчы ў ажыўленні музейных экспазіцый! Тут нікога нічым не здзівіць, бо на размову сабраліся тыя, хто выводзіць формулы здзіўлення для іншых пры знаёмстве з беларускай культурай у яе паглыбленні. Людзі навукі і тыя, хто за культуру адказваюць, прыйшлі зацікаўлена пагаварыць у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

На сумесным пасяджэнні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ішла гаворка пра самае важнае: «Культура — ідэйная аснова беларускай дзяржаўнасці». З гэтай думкай ажыццяўлялася праграма навуковага супрацоўніцтва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на 2010-2015 гады. Цяжка без навуковай глебы стварыць адзіную культурную прастору, дзе хутка мяняюцца ўмовы існавання народаў: гэта ўплывае на выбар прыярытэтаў. Але ёсць з'явы, непадуладныя часу, якія сведчаць пра менавіта чалавечы характар культуры, праяўляючы наш свет ва ўсім яго стракатым багацці. А тут адразу, можа, і не заўважыш і не скажаш, пакуль разумныя людзі не патлумачаць. Яны і сведчаць пра фарміраванне інфармацыйнага грамадства, пра тэндэнцыю да глабалізацыі культур, але і ведаюць, як за вялікім не страціць адметнае лакальнае, створанае асобным народам, падкрэсліць яго вартасці і, калі ёсць магчымасць, прывабіць прадстаўнікоў іншых культур — не падобнае ні на кога заўсёды цікава.

### САБЕ

На думку **старшыні прэзідыума НАН Беларусі Уладзіміра ГУСАКОВА**, праграма рэалізуецца даволі эфектыўна, асабліва ў тых сферах, якія задаюць кірункі развіцця культуры: напрыклад, у заканатворчай дзейнасці, у плане экспертных заключэнняў, калі гаворка ідзе пра наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці аб'екту нацыянальнай спадчыны. Некаторыя этапы супрацоўніцтва праявіліся ў канкрэтных праектах. Натуральна, прыслухоўвацца да экспертаў-навукоўцаў трэба, калі гаворка пра лёс гістарычных аб'ектаў, і асабліва археалагічных помнікаў ці помнікаў нематэрыяльнай культуры. Як паведаміў **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ**, пры падтрымцы ЮНЕСКА Інбелкультам быў створаны Нацыянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі і сайт «Жывая спадчына», распрацавана практычнае кіраўніцтва да ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Спецыялісты Інбелкульта даследуюць стан аб'ектаў спадчыны, даюць экспертныя заключэнні на абрады разам з супрацоўнікамі акадэміі навук. Створаны дзяржаўны каталог музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. На 10 снежня ў дзяржаўны каталог перададзены звесткі пра больш як 148 тысяч асабліва каштоўных музейных прадметаў. У тым ліку ў 2014 годзе аб 11 876 музейных прадметах. У музейны фонд уключающа прадметы ўсіх дзяржаўных музеяў, а таксама могуць быць уключаны рарытэты прыватных музеяў — па іх пісьмовай заяве. Але такіх заяў ад прыватных музеяў не паступала, паводле слоў міністра.

Але ці не самы цікавы праект — калі тое, што клапоціць навукоўцаў, пачынае клапаціць прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання.

— Праграма навуковага супрацоўніцтва была прынята ў 2010 годзе, — паведаміў Барыс Святлоў. — Спецыялісты-навукоўцы ўдзельнічалі ў абмеркаванні праекта Кодэкса Рэспублікі Беларусь «Аб культуры». Выкананне мерапрыемстваў спрыяла ўдасканаленню кадравага патэнцыялу ў сферы культуры. Відавочна, што аб'яднаны патэнцыял культуры і навукі выкарыстаны яшчэ не ў поўнай меры.

### І ЛЮДЗЯМ

А час усё падкідвае новыя задачы. Адна з іх — упісаць сваю культуру ў абшары агульначалавечай. І тут важна зразумець, якім чынам яе ўзбагачае мастацкая сфера, якая сёння развіваецца ў супрацьстаянні з прадуктамі масавай культуры.

**Аляксандр ЛАКОТКА, дырэктар дзяржаўнай навуковай установы Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук**, адзначыў:

— Патрэбна новая ідэалагічная парадыгма, сутнасць якой заключаецца ў паразуменні адзінства культуры традыцыйнай і прафесійнай, элітарнай, этнічна разнастайнай. Асновай нацыянальнай культуры ва ўсіх сферах яе функцыянальнага развіцця з'яўляецца беларуская мова. Беларуская нацыянальная культура мае рэгіянальную разнастайнасць, што патрабуе захавання мясцовых культурных традыцый, арганічнага суіснавання нацыянальных і рэгіянальных культурных рыс, развіцця формаў і спосабаў трансляцыі рэгіянальных культур... Дэмаграфічны крызіс, эканамічны спад паставілі еўрапейскія краіны перад праблемай абароны нацыянальных і духоўных культурных каштоўнасцяў. Сёння задачамі ААН, Еўрасаюза ў сферы аховы і развіцці культурнай разнастайнасці свету павінен стаць працяг работы па захаванні нацыянальных моў і дыялектаў, аховы песеннай і вуснапаэтычнай культурнай спадчыны народаў і этнічных груп. Развіццё культурнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Еўрасаюзам паспрые ў тым ліку і культурнаму ўзбагачэнню Еўропы, многія культурныя карані якой бяруць пачатак з беларускай зямлі.

На думку кіраўніка Цэнтра беларускай культуры, мовы і літаратуры, дзеля інавацыйнага развіцця культуры як асновы суверэнітэту і нацыянальнай ідэнтычнасці неабходна вырашэнне наступных праблем: развіццё мастацтвазнаўчых навуковых школ і падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, асабліва ў такіх галінах, як ахова, рэстаўрацыя помнікаў гісторыі і культуры, сучасная мастацкая культура. Выкарыстанне нацыянальнай культурнай спадчыны ў сферы турызму — гэта важны фактар развіцця рэгіёнаў, стварэнне свабодных эканамічных зон, новых працоўных месцаў, фарміраванне мясцовай інфраструктуры. Ён жа прапанаваў на месцы старога будынка музея Вялікай Айчыннай вайны на Кастрычніцкай плошчы пабудаваць Музей беларускай дзяржаўнасці. Ён бы ўпісаўся ў прастору Палаца Рэспублікі, Палаца прафсаюзаў ды ў ансамбль праспекта Незалежнасці. Дзяржаўнасць і незалежнасць — рэчы, здаецца, непарыўныя.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Ларыса Цімошык. Справа рук чалавечых